Навумовіч-Карачун Г.С., студ. БДУКМ
Навуковы кіраўнік – Друк Г.М.,
кандыдат філалагічных навук, дацэнт

# ТЭМА ДЗЯЦІНСТВА Ў ЛІРЫЧНЫХ МІНІЯЦЮРАХ ЯНКІ БРЫЛЯ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У беларускім літаратуразнаўстве Янка Брыль лічыцца прызнаным майстрам лірычнай мініяцюры. Менавіта ў гэтым жанры пісьменнік працаваў на працягу ўсяго свайго жыцця. Лірычны герой мініяцюр Брыля, наглядальнік і суддзя – гэта аднагодак пісьменніка, які з вышыні свайго жыццёвага досведу абмяркоўвае з чытачом надзённыя праблемы і праблемы планетарнага маштабу, унікае ў псіхалогію свайго сучасніка. Ідэйна–філасофскі змест мініяцюр Янкі Брыля накіраваны не проста на аналіз рэчаіснасці, а на выяўленне светлых і цёмных бакоў жыцця на падставе ўласнага досведу, удасканаленне і нават перавыхаванне нашага сучасніка.

Зварот Янкі Брыля да тэмы дзяцінства абумоўлены ў пэўнай ступені яго ўласным жаданнем спасцігнуць самыя раннія крокі ў жыццё, спробай навучыцца ўспрымаць сябе цэласна, у кантэксце біяграфічна-гістарычнага часу.

Дзяцінства для Янкі Брыля – той асаблівы свет, які цалкам станоўча ўплывае на духоўнае абнаўленне асобы, а для аўтара яшчэ служыць і крыніцай творчага натхнення.

Па-трэцяе, у дзіцячым мысленні шмат агульнага з творчым мысленнем, якім валодае Янка Брыль. Беларускі празаік адчувае ўнутраную патрэбу – пісаць для дзяцей. “Захапляцца маленствам, наогул пачаткам жыцця, пісаць пра гэта – найцікавей” [2, с. 112], – зазначаў Я.Брыль у “Думках у дарозе”.

Актуальнасць зместу лірычных мініяцюр Я.Брыля ў рэчышчы нашага даследавання заключаецца ў тым, што ў іх вельмі востра закранаюцца праблемы выхавання юнага пакалення, дзіцячай агрэсіі і гуманізму, таленавіта выяўляецца спецыфіка дзіцячай псіхалогіі. Тэма дзяцінства, якая гучыць непасрэдна ў зб. “Жменя сонечных промняў” або цыкле мініяцюр

“Адкуль паэзія”, не з’яўляецца для празаіка перыферыйнай. Даследаваць і выяўляць свет дзяцінства ў эмацыянальна–псіхалагічных дэталях – гэта для Янкі Брыля асаблівы спосаб мастацкага мыслення. Яго мініяцюры часта адлюстроўваюць “простыя чалавечыя радасці” [1, с. 72]. Але пісьменнік валодае здольнасцю знаходзіць у звычайнай сітуацыі такія дэталі, дзякуючы якім невялікі мастацкі твор набывае гуманістычнае гучанне.

У кожнай мініяцюры выяўляецца захапленне дзіцячай словатворчасцю, цікавасць да першых крокаў пазнання маленькім чалавекам свету. У мініяцюрах унутраны свет дзіцяці Янка Брыль раскрывае не толькі ў шчаслівы бесклапотны час маленства яго сярод сямейнікаў, але і тады, калі не дзіця ўжо, а падлетак уваходзіць у дарослае працоўнае жыццё.

Вельмі цікавымі з’яўляюцца мастацкія вобразы дзяцей, створаныя ў лірычных мініяцюрах. Адным сказам аўтар дэтальна, выразна перадае знешні выгляд дзяцей, праз які можна лёгка зразумець пэўныя рысы характару героя. Хлопчык  “вушаты, з мілай мордачкай, трохгадовы ваяка” [3, с. 52]; “чырванашчокі, вочы блішчаць, рукі ўсе падрапаны да крыві” [3, с. 66]; “а ў Жэнькі, пры ўсёй яго сур’ёзнасці, тырчаць ружовыя вушы” [3, с. 57]; “беленькі пярэднік, белыя шкарпэтачкі ў басаножках, беленькі адмысловы бант, сама такая чыстая бяляначка” [4, с. 139]; “у Алесі румяныя, поўныя шчокі, а салідарнасць – на пятым годзе – як у дарослай. Нават і хустка завязана “пад бараду”,  як у бабулі–калгасніцы” [3, с. 64]; “тупае па дарожцы толькі ў трусіках, бела–пяшчотная, поўненькая” [3, с. 64]. Партрэтныя характарыстыкі, лаканічныя і індывідуальна-непаўторныя, – ці не самы важны спосаб стварыць вобраз дзіцяці.

Чытачу вобраз дзіцяці, створаны Янкам Брылём, заўсёды бачыцца адухоўлены, светла-ўзнёслы. Героі большасці яго лірычных мініяцюраў – дзеці з чыстаю душой, эстэтычна развітыя. Так, спагадлівасць і дабрыню выяўляе хлопчык, за якім назірае пісьменнік на птушыным рынку (ён купляе птушку для таго, каб выпусціць яе на волю). Такая асаблівасць у стварэнні вобраза дзіцяці выяўляе духоўна-гуманістычны светапогляд пісьменніка.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Я.Брыль раскрывае свет дзіцяці як непаўторны, індывідуальна яркі, шматгранны. Майстэрства Брыля-псіхолага раскрываецца ў даследаванні і выяўленні спецыфічных асаблівасцяў дзіцячага светаўспрымання – імправізацыі і парадаксальнасці, шчырасці, праўдзівасці, непасрэднасці і інш.

Янка Брыль разумее, што праблема выхавання незвычайна складаная На думку празаіка, дарослыя павінны быць далікатнымі ў адносінах да дзяцей. У справе выхавання яны вядуць сябе вельмі часта непаслядоўна, супярэчліва: ствараюць чытаннем, гутаркай адзін ідэал, а сваімі дэманструюць зусім іншы, часта негатыўны прыклад. Згадаем мініяцюру пра хлопчыка, які вельмі любіў надакучлівае кацяня і моцна абураўся, калі яго скідалі, гналі ці білі. Ён тады браў кацяня на рукі, гладзіў і "здзіўлена глядзеў на ўсіх, асабліва, здаецца, на бацьку…" [3, с. 58]. Праблема ўзаемаадносінаў паміж дзецьмі і дарослымі застаецца адкрытай. Дарослым часта не хапае культуры паводзінаў з дзецьмі.

Надзейным сродкам выхавання дзяцей пісьменнік лічыць прыгажосць роднай прыроды. Любоў чалавека да сваёй зямлі, да роднага кута – адзін са шляхоў фарміравання духоўнасці асобы. Свет прыроды ў мініяцюрах знаходзіць лірычнае ўвасабленне: прырода ў Янкі Брыля стаіць на мяжы рэальнасці і казкі, яна хавае ў сабе таямніцу жыцця. Зліўшыся з прыродай, можна знайсці разгадку сэнсу быцця наогул і наталіць душу, якая прагне яснасці. Такія адносіны з прыродай памятаюцца мастаку з юначых гадоў.

Дзіця, як асоба, фарміруецца менавіта ў сям'і, таму Янка Брыль удзяляе шмат увагі выхаванню дзіцяці ў паўнацэннай сям'і. Чытаючы мініяцюры, адчуваем, што атрыманая з боку бацькоў і родных людзей любоў – той агеньчык, які здольны саграваць чалавека ўсё яго жыццё. Калі сямейнікі раздзяляюць радасць дзіцяці, калі ўмеюць ацаніць яго дасягненні, ад душы жадаюць яму поспехаў, клапоцяцца матэрыяльна, то і дзіця імкнецца вучыцца дасягаць пастаўленых мэтаў.

Аналіз лірычных мініяцюр паказвае, што Янку Брыля вельмі моцна хвалюе лёс дзяцей. Праблема трагічнага лёсу дзіцяці ў гады Вялікай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Айчыннай вайны закранаецца і ў творах, не прызначаных спецыяльна для дзіцячага чытання. Многія з іх з’явіліся пасля стварэння пісьменнікам разам з А.Адамовічам і У.Калеснікам дакументальнай кнігі “Я з вогненнай вёскі”. Гэта такія апавяданні, як “Полымя”, “Калыска”, “Іваны”, “З прасвету акна”. Не можа пісьменнік змірыцца з тым, што ў дзяцей вайны не было маленства, што ў малым ўзросце яны ўжо бачылі дарослыя трагедыі.

На тэму чарнобыльскай трагедыі Янка Брыль напісаў апавяданне-мініяцюру “На сцежцы – дзеці”. Інтанацыя, што гучыць у самой назве, - вельмі трывожная. Янка Брыль асэнсоўвае лёс дзяцей, думаючы пра пагрозу новай атамнай вайны. Як гуманіст, ён выступае супраць усялякай вайны, бо для яго дзеці і вайна, якая нясе зло, – паняцці несумяшчальныя. Пісьменніку важна акцэнтаваць увагу сучасніка на тым, што “прапусціўшы” важны этап – маленства, калі фарміруецца псіхалогія, характар дзіцяці, актыўна засвойваецца сістэма духоўных каардынат, чалавек пазбаўляецца самага галоўнага – творчых асноў успрымання свету. На думку празаіка, калі ў дзяцей не будзе дзяцінства, то тады не будзе і шчасця на планеце. Пісьменнік упэўнены, што шчасце маленства – у бяспецы, міры, дружбе.

Дзіцячы свет уражвае беларускага мастака слова казачнасцю, цнатлівасцю, унутранай свабодай адносін і жыццялюбасцю – усім тым, чаго так часта не хапае дарослым, каб дамовіцца аб вечным міры, братэрстве і дружбе на зямлі. Дзяцінства ўключана Брылём у кантэкст агульначалавечай духоўнасці і выступае эталонам жывой душы, сімвалам вызвалення сусветнай душы з ланцугоў нізкіх рэфлексаў – страху і пагроз, агрэсіўнасці і падняволення. Так успрымаць дзяцей, як успрымае і разумее іх Янка Брыль, здольны толькі сапраўды таленавіты творца.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Спіс выкарыстанай літаратуры:

1. Беларуская дзіцячая літаратура: вучэбны дапаможнік / А.М. Макарэвіч; пад агульнай рэдакцыяй А.М. Макарэвіча, М.Б. Яфімавай. – Мінск: Вышэйшая школа, 2008. – 688 с.

2. Брыль, Я. Думкі ў дарозе / Я. Брыль. – Мінск: Народная асвета, 1987. – 196 с.

3. Брыль, Я. Збор твораў: у 5 тамах / Я. Брыль. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1981. – Т.5: Лірычныя запісы і мініяцюры / Я. Брыль. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1981. – 591 с.

4. Брыль, Я. На сцежцы дзеці / Я. Брыль. – Мінск: Народная асвета, 1985. – 47 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ